Комсамольскае прывітаньне I Менскай гарадзкой конфэрэнцыі ЛКСМБ

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80
1 год	3 р. 30

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.

АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага № —2 кап.

№ 2 (1271) | СУБОТА, 3-га студзеня 1931 г.

Адчынілася мен. гор. конфэрэнцыя ЛКСМБ

Учора ўвечары, у клюбе харчавікоў, адчынілася I Менская гор. конфэрэнцыя ЛКСМБ.

Конфэрэнцыя абрала прэзыдыум з 47 асоб, у склад якога увайшлі т. т. Гей, Шарангович, Кавальчук, Шпэктараў, Пятушкоў, Паляков, Рыдзеў, Гуткін, Якович, Скробат, Магільня, Брайдэр, Сухаліцкі, Старобінец, Чартоў і інш.

Ко фэрэнцыя зацьвердзіла наступны парадак дню: 1) Вынікі пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б). 2) Вынікі выкананьня ударнага кварталу і задачы ЛКСМБ на трэці год пяцігодкі. 3) Выбары Гаркому і рэвкамісіі.

З дакладам аб выніках аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) выступіў сакратар горкому КП(б)Б т. Кавальчук.

Будаваць фабрыкі мяса

Пытаньню разьвіцьця жывёлагадоўлі надаецца выключная ўвага. Партыя і рабочая кляса прымаюць шэраг конкрэтных захадаў па павялічэньню гурту буйнай рагатай жывёлы і сьвіней, організуюцца буйныя соцыялістычныя жывёлагадоўчыя гаспадаркі—савгасы і колгасы.

XIII зьезд КП(б)Б у сваіх рашэньнях вызначыў конкрэтныя мерапрыемствы ў працы партыйных, комсамольскіх, савецкіх і іншых грамадзкіх організацый. Зьезд прапанаваў дабіцца „у галіне разьвіцьця буйнай рагатай жывёлы максымальнага пашырэньня малочнага гурту. У гэтых адносінах зьезд надае асаблівую ўвагу справе організацыі малочных, жывёлаводных савгасаў і колгасаў, паставіўшы задачу давядзеньня ў 1930-31 годзе таварнага малочнага гурту ў савгасах і колгасах да 75.000 галоў, а ў 1931-32 годзе ня менш 100000 галоў, удзяліўшы асаблівую ўвагу організацыі спэцыяльных прыгародных фэрмаў", а па сьвінагадоўлі:—„давесьці гурт сьвінаматак у савгасах у 1930—31 годзе ня менш 50 тысяч штук і ў сьвінаводчых колгасах 1930—31 году ня менш 100.000 штук. У сувязі з чым устанавіць наступны выпад таварных сьвіней: на 1930—31 год у савгасах—250.000 штук і ў колгасах—500.000 штук".

З часу гэтай пастановы XIII-га зьезду КП(б)Б мы маем значныя дасягненьні ў галіне выкананьня праграмы жывёлагадоўлі, у прыватнасьці ле асноўнага зьвяна—сьвінагадоўлі.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) адзначыў, што поспехі якія мы маем у галіне організацыі жывёлагадоўчых савгасаў і колгасаў і развіцьця ў іх сьвінагадоўлі, далі нам поўную магчымасьць шырока разгарнуць работу па організацыі жывёлагадоўчых савгасаў і колгасаў і жывёлагадоўчых фэрм пры рабочай кооперацыі, таму чым мы выкарыстаем усе асноўныя магчымасьці, каб у 1931 годзе узнавіць беспэрабойнае і лепшае забесьпячэньне прамысловых цэнтраў мясам.

Задачы, пастаўленыя перад 1931 годам у галіне вырашэньня мясной проблемы, патрабуюць ад комсамолу самай энэргічнай і настойлівай работы за выкананьне намечанага партыяй пляну разьвіцьця жывёлагадоўлі.

БССР у агульнай сыстэме рэспублік Савецкага Саюзу заклікана адыграць вялікую ролю у гэтым напрамку. Комсамол Беларусі, пад кіраўніцтвам партыі, павінен будзе правесьці вялікую працу—за асьвечаньне і перавыкананьне пляну 1931 году. Гэтую задачу магчыма выканаць толькі пры ўмове калі шырокія колы батрацкабядняцкай і колгаснай моладзі прымуць практычны ўдзел у выкананьні пляну 3-га году пяцігодкі ў галіне разьвіцьця жывёлагадоўлі, калі будзе мобілізаваны іх энтузіязм усіх комсамольцаў на барацьбу за колектывізацыю сельскай гаспадаркі, на барацьбу з кулацтвам і ліквідацыю яго, як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі, за разьвіцьцё буйных мясных фабрык шырока разгортваючы ва ўсёй сваёй практычнай рабоце мэтад соцспаборніцтва і ўдарніцтва, організацыю ўдарных брыгад і соцыялістычнага абмену вопытам у сельскай гаспадарцы.

Практычна комсамольскія ячэйкі колгасаў і савгасаў павінны забясьпечыць у гаспадарках максымальнае разьвіцьцё маладняка, буйнай рагатай жывёлы і сьвіней, 100 пр. захаваньне прыплоду маладняка ў зімовы пэрыод, завастрыўшы асаблівую ўвагу на гадоўлі маладняка зімовага апаросу.

Ня менш вялікае значэньне для вырашэньня жывёлагадоўчай проблемы мае ўтварэньне кармовай базы. Комсамольскія ячэйкі павінны зараз-жа праверыць забясьпечанасьць савгасаў і колгасаў кармамі, організаваць работу па рацыянальнаму іх скарыстаньню, устанавіць суровыя кармовыя рацыёны, організаваць работу па ўнядзеньню тарпяной падсьцілкі, што дапаможа павялічыць кармовую базу ў гаспадарцы за кошт эканоміі саломы.

Нарэшце—работа па рацыяналізатарству, вынаходзтву і масавых доследах. Комсамольскія ячэйкі і райкомы павінны узяць на сябе абавязак організаваць масавыя доследы, вынаходзтва і рацыяналізацыю, ўвязваючы ўсю работу з работай навукова-дасьледчых установ.

Пад кіраўніцтвам партыйных ячэек, комсамольскім ячэйкам савгасаў і колгасаў трэба заразжа разгарнуць масавую шырокую праверку, як савгасы і колгасы выконваюць дырэктывы партыі аб разьвіцьці жывёлагадоўлі і сьвінагадоўлі, давесьці да кожнага савгасу і колгасу плян разьвіцьця сьвінагадоўлі на 1931 год і забясьпечыць актыўны ўдзел комсамольскай і працоўнай моладзі ў яго выкананьні.

Кожны крок заваёў па жывёлагадоўчым фронце—удар па капіталістычных элемэнтах гораду і вёскі. Разьбіваючы опортуністычныя енкі аб непасільнасьці тэмпаў, будзем ударна будаваць фабрыкі мяса.

Адчынілася першая нарада па сьвінагадоўлі

Учора ў чытальні Цэнтральнага Дому Селяніна пачала сваю працу першая ўсебеларуская нарада па сьвінагадоўлі.

Першым пытаньнем стаяў даклад т. Міцькова аб разьвіцьці сьвінагадоўлі ў БССР (вынікі 2-га году пяцігодкі) і контрольныя лічбы 3-га году пяцігодкі.

2. Са дакладам ЦК ЛКСМБ аб удзеле комсамольскай організацыі ў сьвінагадоўлі і выніках сьвіной эстафэты.

Праца нарады працягнецца два дні.

З марксыцка-ленінскім узброеньнем, з бальшавіцкай энэргіяй—на барацьбу за пабудову соцыялізму

Выпускнікам Комвузу імя Леніна—комсамольскае прывітаньне

Прывітаньне тав. Гея

Дарагія таварышы!

Вітаю новы выпуск Комвузу!

Мы ўступілі ўжо ў паласу соцыялізму,—такі быў асноўны вывад работы XVI з'езду УсеКП(б). Партыя дасягнула гэтага, рашуча ліквідуючы выкарчоўваючы рэшткі капіталізму ў краіне, шырока разгарнуўшы соцыялістычнае будаўніцтва ў горадзе і на вёсцы.

Толькі перамагаючы правы опортунізм, адмятаючы „левацкія" заскокі, выкрываючы двурушніцтва,—партыя забясьпечыла паспяховае соцыялістычнае будаўніцтва.

Новы атрад будаўнікоў соцыялізму—VI выпуск Комвузу, закасаўшы рукавы, возьмецца на месцах за змаганьне і работу.

З комуністычным прывітаньнем

К. Гей.

Будзьце цьвёрдымі барацьбітамі за лінію партыі!

Шчыра вітаю новы датэрмін вы выпуск бальшавікоў-ленінцаў Усебеларускага Комвузу імя У. І. Леніна. Шырокае разгортваньне соцыялістычнага наступленьня па ўсім фронце ў надзвычайна складаных умовах абвострэнай клясавай барацьбы вымагае ўсё новых пролетарскіх кадраў, пабальшавіцку загартаваных і тэарытычна выхаваных на аснове марксызму-ленінізму. Гэтым і тлумачыцца датэрміновасьць вашага выпуску з Комвузу.

Шчыра жадаю і веру, што Вы, таварышы, якіх партыя пасылае на практычную работу, апраўдаеце давер'е партыі і будзеце вернымі і цьвёрдымі барацьбітамі за ленінізм, за генэральную лінію партыі, супроць усялякіх ухілаў ад генэральнай лініі і ў першую чаргу супроць правага ўхілу, як найбольш небясьпечнага на даным этапе.

Не забывайце важнага значэньня ва ўмовах БССР ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай політыкі і рашучага змаганьня супроць вялікадзяржаўнага расійскага шовінізму, як найбольшай небясьпекі на даным этапе, супроць контррэволюцыйнага беларускага нацыянал-дэмократызму і іншых шовінізмаў.

Ня спыняючы, а ўсё больш разгортваючы бальшавіцкія тэмпы соцбудаўніцтва, умацняючы дыктатуру пролетарыяту пад кіраўніцтвам компартыі, рабочая кляса перамагае ў барацьбе за соцыялізм, будуе і пабудуе соцыялізм.

Няхай жыве перамога соцыялізму!

Няхай жыве правадыр працоўных у барацьбе за соцыялізм—компартыя і яе ленінскі ЦК!

З ком. прывітаньнем

А. ЧАРВЯКОЎ.

ЦК КП(б)Б і ЦО „Зьвязьдзе"

Мы студэнты выпускнікі комвузу імя Леніна, у дзень свайго выпуску шлем гарачае бальшавіцкае прывітаньне кіраўніку соцыялістычнага будаўніцтва БССР—ЦК КП(б)Б і ідэйнаму організатару і выхавацелю бальшавіцкіх кадраў — ЦО „Зьвязьдзе".

Загартаваныя ў Ленінскай кузьні, узброеныя марксісцка-ленінскімі ведамі, будзем змагацца за паспяховае выкананьне і перавыкананьне пяцігодкі за 4 гады, за ліквідацыю кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі.

Рашуча праводзячы генэральную лінію партыі, будзем бязьлітасна змагацца супроць правага і „левага" опортунізму, двурушніцтва і прымірэнцтва да ўхілаў, супроць вялікадзяржаўнага шовінізму, контррэволюцыйнага беларускага нацыянал-дэмократызму і яго агентуры нацыянал-опортунізму. А таксама шовінізму іншых колераў.

Няхай жыве Ленінскі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б—правадыр сусьветнага будаўніцтва!

Няхай жыве сусьветная пролетарская рэволюцыя і яе баявы штаб—Комінтэрн!

Партыйна-комсамольская і профсаюзная нарада па піонэрруху

За сыстэматычны, актыўны ўдзел у барацьбе за прамфінплян, саўгасы і колгасы

(Дзёньнік нарады)

1-га студзеня.—Клюб Працасьветы. У розных кутках фойэ зьбіраюцца групы. Чуваен здаровы, задорны сьмех. Гэта дэлегаты 1-ай Усебеларускай партыйна-комсамольскай і профсаюзнай конфэрэнцыі сабраліся, каб абгаварыць пытаньні дзіцячага комуністычнага руху.

Піонэры паказваюць узорныя прыклады

Праца конфэрэнцыі распачынаецца дакладам тав. Гайдукевіча.

Дакладчык дэталёва абмалёўвае становішча дзіцячай піонэрскай організацыі Беларусі, яе працу, дасягненьні і недахопы.

— За час з IX-га зьезду ЛКСМБ піонэрская організацыя,—кажа тав. Гайдукевіч—наблізілася да актыўнага ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве. Піонэрская організацыя, ад кампанейскага ўдзелу ў паходзе за ўраджай, культпаходзе перавыбарчай кампаніі саветаў, пераходзіць да сыстэматычнага, актыўнага ўдзелу ў барацьбе за прамфінплян, за савгасы і колгасы.

— Піонэрская організацыя ня менш актыўна змагалася і змагацца на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва, аб чым гаворыць шэраг прыкладаў, калі піонэры змагаюцца за ажыцьцяўленьне нац. політыкі партыі, за ўсеагульнае пачатковае навучаньне, ліквідацыю няпісьменнасьці і інш.

Не замацавалі дасягнутых посьпехаў

— Ажыўленьне работы піонэр-організацыі, асабліва пасьля правядзеньня ўсесаюзнага зьлёту,—ня было замацавана і скарыстана для далейшага пашырэньня ўдзелу дзяцей у жыцьці вытворчасьці, колгасаў і савгасаў.

Паасобныя комсамольскія організацыі паслабілі кіраўніцтва піонэрскай організацыяй, а ўвага грамадзкасьці да дзіцячага комуністычнага руху зьнізілася, што спрыяла заняпаду працы выхаваньня дзяцей—і нават развалу паасобных піонэр-атрадаў.

Пералом ёсьць

— Аднак захады, якія былі ўжыты пасьля правядзеньня баявога агляду піонэрскай організацыі, і вытворча-культурных манэўрах, выкананьня ўраджайнага заданьня — далі значны штуршок у палепшаньні працы шэрагу піонэр-організацыі. У значнай частцы організацыі дзейнасьць атрадаў ажывілася і праца іх прыстасоўваецца да задач і патрабаваньняў рэконструкцыйнага пэрыоду.

Далей тав. Гайдукевіч падрабязна спыняецца на грунтоўных недахопах у рабоце ДКА, на комуністычным выхаваньні дзіцячых мас, на важнейшых проблемах падрыхтоўкі кадраў, правядзеньні політэхнізацыі, удзеле дзяцей у выкананьні праводзімых партыяй гаспадарча-політычных мерапрыемстваў на шэрагу іншых практычных задач сёньнешняга дня.

Факты і лічбы

За пэрыод ад 9-га зьезду да 1 кастрычніка 1930 году піонэрская організацыя з 21174 чалавек вырасла да 95667 чалавек.

— Піонэры адсортавалі 24000 пуд. насеньня, сабралі 25873 пуды утыльсыравіны, падпісаліся на 35396 руб. па пазыку і правялі шэраг іншых каштоўных мерапрыемстваў.

— Піонэры ўжо даволі ўразумелі важнасьць і неабходнасьць змаганьня за прамфінплян і дапамагаюць сваім бацькам у ліквідацыі прарываў.

Ход перавыбарчай кампаніі саветаў паказаў, што піонэрская організацыя, праводзячы пасільныя для яе мерапрыемствы, аказвае вялікую дапамогу ў выкананьні політычных задач партыі і ўраду.

Для ўдзелу ў спрэчках па дакладу тав. Гайдукевіча запісалася 50 чал., але з прычыны позьняга часу пасьпелі выказацца толькі трое.

Дэлегаты даводзяць

Тав. Браништэйн (Чырвона-Слабодзкі раён) давёў, што барацьба за комуністычнае выхаваньне дзяцей ня стала яшчэ актуальнай у працы цэлага шэрагу партыйных і комсамольскіх ячэек і грамадзкіх організацый, ён сказаў, як піонэры праводзілі падрыхтоўчую працу сярод насельніцтва і ўдзельнічалі ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў.

— Піонэры правялі дэмонстрацыю, організавалі 13 пакояў для дзяцей на час перавыбараў, узялі шэфства над сьвінарнікамі па іх ацяпленьню.

Тав. Паўлоўскі (Дрысенскі раён) сказаў, што організацыя, дзякуючы баявому агляду, палепшыла сваю працу і зараз значна вырасла. У раёне створаны 3 новыя атрады, якія уцягнулі ў піонэрорганізацыю 100 дзяцей.

Тав. Рубінштэйн (Віцебскі гарком КП(б)Б) адзначыў, што справа выхаваньня дзяцей шэрагу месц не пастаўлена яшчэ на належную політычную вышыню.

На гэтым скончылася праца конфэрэнцыі 1 студзеня. Працяг спрэчак перанесены на другі дзень.

Віт. СІДАРУК.

Колгасныя і савгасныя ячэйкі! Разгортвайце масавае вопытніцтва, вынаходзтва і рацыяналізатарства у сьвінагадоўлі

Выканаць і перавыканаць програму сьвінагадоўлі


„Праз год мець магчымасьць забясьпечыць поўнасьцю снабжэньне мясам"
(Сталін—палітсправаздача ЦК)

Выкарыстаць практыку перадавых—падцягнуць адстаючых

За навуковую консультацыю савгасаў і колгасаў

Заданьне комуністычнай партыі па вырошчваньню сьвіней у соцыялістычным сэктары і здачы іх для харчаваньня рабочага насельніцтва СССР на бліжэйшыя гады павінна быць выканана і перавыканана.

Неабходна павесьці шырокую работу па ўкараненьню ўсіх лепшых спосабаў тэхнікі ў буйныя сьвінаводчыя гаспадаркі, навукова-дасьледчыя ўстановы павінны стаць штодзённымі консультантамі сьвінаводных савгасаў і колгасаў. Савгасы і колгасы, у сваю чаргу, павінны даваць штодзённа свае заданьні для іх хуткага вырашэньня дасьледчым установам.

Работу дасьледчых установаў трэба паставіць так, каб яна дапамагла кожнаму савгасу і колгасу праводзіць барацьбу за вырашчваньне кожнага лішняга парсьвінка.

Неабходна навукова-дасьледчым установам ператварыцца ў барацьбітоў за лепшы вывад сьвіней ня толькі на сваіх вопытных базах, але і ў савгасах і колгасах усяго СССР. Патрэбна ўсе буйныя соцыялістычныя гаспадаркі прымацаваць да паасобных вопытных установаў і ўскласьці на навуковыя ўстановы адказнасьць за работу прымацаваных гаспадарак.

Консультацыя павінна давацца па ўсіх пытаньнях сьвінаводчай гаспадаркі. Неабходна зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на консультацыю ў галіне будаўніцтва. Аб'езд савгасаў паказвае, што тэхнагляд за будаўніцтвам недастатковы. Асаблівую ўвагу зьвяртаюць на сябе новыя часткі пабудоў, мала распрацаваныя для будаўніцтва. Сюды адносяцца асьвятленьне, каналізацыя, вэнтыляцыя, кармушкі і г. д. Савгасам і колгасам трэба даць самыя дэталёвыя чарцяжы і сталую, жывую консультацыю.

Другое вялікае пытаньне гэта—консультацыя па кармленьню, догляду, утрыманьню сьвіней. У галіне кармленьня наглядаецца недахоп вітаміннага і мінэральнага харчаваньня.

Баючыся прастудзіць сьвіней, звычайна трымаюць іх усю зіму без сьвежага паветра. Пры такім утрыманьні сьвіньні робяцца кволымі і родзяць слабых і хваравітых парасят, якіх нельга вырасьціць. Такія парасяты на працягу некалькіх дзён усе здыхаюць.

Важнейшая задача ў гэтую зіму ня толькі захаваць сьвіны гурт, але захаваць і вырасьціць увесь зімовы і вясеньні апарос пры ўсіх тых умовах, якія зараз маюцца ў савгасах і колгасах. Вырасьціць парасят пры нашых умовах, можна, трэба толькі сур'ёзна паставіць гэтую справу і наладзіць выстарчальную жывую і пісьмовую консультацыю ўсіх работнікаў савгасаў і колгасаў. Турэмнае заключэньне матак і парасят у сьпёртых памяшканьнях, пазбаўленьне прагулак, харчаваньне без вітамінаў і мінэральны голад прыводзіць к пагібелі да 90 проц. парасят асеньніх, зімовых і вясеньніх апаросаў. А між тым, правільная організацыя вырошчваньня парасят у самых простых умовах магчыма без усякіх белых паносаў, рахітаў і г. д.

Вырашчваньне парасят у савгасах і колгасах трэба паставіць на навуковую базу. Навуковыя ўстановы павінны даць выстарчальную консультацыю як па пытаньню вырашчваньня, так і організацыі працы ў сьвінаводчых савгасах і колгасах.

Пытаньні барацьбы з хваробамі і ачоўкай сьвіней зьяўляюцца надзвычайна важнымі і павінны быць забясьпечаны консультацыяй.

Консультацыя сьвінаводчых савгасаў і колгасаў павінна выпрацоўвацца як сыстэматычнымі выездамі на месца так і пісьмова. Навукова-дасьледчы інстытут сьвінагадоўлі ў Менску ўзяў на сябе абавязак сыстэматычна наведваць сьвінаводныя гаспадаркі адзін раз у месяц. Дзеля гэтага БССР падзелена на групы, да якіх прымацаваны спэцыялісты інстытуту. Шэраг работнікаў савгасаў і колгасаў зьяўляюцца супрацоўнікамі-корэспандэнтамі інстытуту і абменьваюцца з ім сваім вопытам.

Організоўваюцца кароткатэрміновыя курсы сьвінаводаў і дактароў па пытаньнях вырошчваньня парасят у 1931 годзе.

У сувязі з тым, што ў савгасах і колгасах штодня ўзьнікаюць усё новыя пытаньні Інстытут організаваў бюро завочнай консультацыі ў ўсесаюзным маштабе па ўсіх пытаньнях сьвінагадоўлі. Бюро дае вычарпаныя адказы ў самы кароткі тэрмін. Бюро консультацыі просіць пісаць работнікаў сьвінасавгасаў і колгасаў аб сваіх дасягненьнях і недахопах. Жывая і завочная сувязь Інстытуту забясьпечыць навуковую консультацыю сьвінагаспадарак соцыялістычнага сэктару і тым самым дапаможа выканаць заданьне партыі і ўраду па вырашэньню мясной проблемы ў СССР.

С. ЖУРЫК.

Лепшы ўдарнік саўгасу Іван

Рацыяналізацыя—ключ для пасьпяховага выкананьня гаспадарчых задач

Абмен соцыялістычным вопытам у сьвінаводчых савгасах і колгасах мае вялізарнае і політычнае значэньне. Для пасьпяховага выкананьня задач, якія пастаўлены партыяй у галіне вырашэньня мясной проблемы, патрабуецца мобілізацыя ўсіх сіл і энэргіі працоўнай грамадзкасьці.

У гэтым артыкуле мы маем на мэце асьвятліць вопыт работы сьвінаводчага савгасу „Блонь" (Пухавіцкі р-н). Гэты савгас мае шмат дасягненьняў.

Партыйная ячэйка, мобілізаваўшы актывістаў рабочых, пры актыўным удзеле комсамольскай ячэйкі і кіраўніцтва савгасу, на 100 проц. выканала плян пасеўных і ўборачных кампаній. Ударніцтва і соцспаборніцтва—вось асноўныя мэтоды, якімі карыстаўся савгас у бальшавіцкай барацьбе за выкананьне свайго прамфінпляну. У савгасе ўсе процэсы вытворчасьці ахоплены пабудаванымі па цэхаваму прынцыпу ўдарнымі брыгадамі. Брыгада сьвінароў спаборнічае з брыгадай па догляду за рагатай жывёлай. Брыгады па жывёлагадоўлі спаборнічаюць з брыгадамі крухмальнага заводу і г. д.

У выніку ўдарнай работы, рабочыя і служачыя савгасу цалкам выканалі свой прамфінплян, а таксама дапамаглі бліжэйшым колгасам. Савгас узараў і насеяў 20-га аўсу, зжаў азімых 30-га, яравых 7-га, абмалаціў двум колгасам збожжа, адпрацаваў 150 машына-дзён на розных работах у колгасах.

Савгас мае 411 га пахаці, 100 га сенажаці, 31 каня, трактар, 160 галоў буйнай рагатай жывёлы, крухмальны і сыраварны заводы. У савгасе ўсяго 61 чалавек рабочых. Савгас на 100 проц. выканаў плян комплектаваньня сьвінаводчага стада на 1 студзеня 1931 году. У савгасе 87 сьвінаматак, 130 галоў маладняка, 5 кныроў. Плян будаўніцтва сьвінарнікаў выканалі на 85 проц. На 75 проц. выканалі плян сілосаваньня кармоў, пашырылі плошчу пад сілосныя культуры—кукурузу, якая дала 20 тон зялёнай масы з га. Ураджай бульбы ў колгасе—700-800 пудоў з га.

Трактар на палявых работах у савгасе працуе 3000 гадзін у год. За 16-гадзінны рабочы дзень ён замяняў пры баранаваньні 20 коняй, пры рабоце пружыннай бараной 20 коняй і пры ўзорцы цаліны—8-10 коняй.

Гэта самая рацыянальная работа, бо трактар заўсёды працуе на вялікіх масывах, пры ўмове нагрузкі ня меньш як на два дні. На кароткатэрміновыя работы трактар не ставіцца, такія работы звычайна выконваюць коньмі. Гэта вельмі важна, бо ёсьць выпадкі, калі ў паасобных гаспадарках трактар пасылаюць працаваць на 2-3 гадзіны, дзе з посьпехам можна абыйсьціся коньмі. З-за нераспарадчасьці і нерацыянальнага выкарыстаньня трактара дарэмна паліцца гаручае.

Да пераходу сьвінагадоўчай гаспадаркі на хлебагаспадарку, сьвіней кармілі выключна мязгою і адходамі ад сыраваранага заводу. У гэты корм дабаўлялі адно кілё збожжавай мешанкі і мінэральных соляй. Такое кармленьне ў савгасе працягвалася 3 гады. Ад гэтага корму прырост сьвіней у дзень быў 0,9 кілё, пры сабекошце жывой вагі—26 кап. кілё. Хоць і наглядаўся дрэнны рост маладняка, але трэба сказаць, што для адкорму, мязга—корм незамяніймы.

На першае мая 1930 году гаспадарка, з астачай ад мінулых гадоў, мае прыбытак у 98692 рублі.

Зоотэхнік Парахневіч.

Да новых перамог

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б), які нядаўна закончыўся, вынес вялізарнай важнасьці рашэньні, якія намячаюць програму далейшага наступу соцыялізму па ўсім фронце.

Пленум падвёў вынікі работы партыі па выкананьню рашэньняў 16 га партзьезду, вынік другога году пяцігодкі.

За гэты пэрыод Савецкі Саюз зрабіў вялікі крок у бок соцыялізму.

Мінулы гаспадарчы год характарызуецца высокімі тэмпамі разьвіцьця індустрыялізацыі, грандыёзнымі клясавымі зрухамі ў сельскай гаспадарцы.

Валавая продукцыя буйнай прамысловасьці за 1929-30 год дала 25 проц. прыросту, перавысіўшы заданьне па пяцігодцы на 5 проц. Пасеўная плошча ў цэлым павялічылася на 8 проц. Пасеўная плошча колгасаў—у два разы больш пасеўнай плошчы, намечанай па пяцігодцы на 1933 год. Разьмер гадавой фабрычна-заводзкай вытворчасьці больш чым у 2 разы перавысіў даваенную гадовую вытворчасьць. Валавы збор збожжа вырас на 21,8 проц. І на падставе гэтых посьпехаў у другім годзе пяцігодкі, пленум намецуў народна-гаспадарчы плян на 1931 год.

У прынятым пленумам рашэньні аб народна-гаспадарчым пляне запроэктаваны высокія тэмпы соцбудаўніцтва. Па прамысловасьці пленум прыняў такія паказчы і:

Аб'ём капітальных работ соцпрамысловасьці і электра-будаўніцтва—у 7.470 мільёнаў рублёў.

Зьніжэньне сабекошту прамысловасьці—на 12 проц.

Прырост валавой продукцыі па ўсёй дзяржпрамысловасьці—у 45 проц., у параўнаньні з 1930 г.

Па прамысловасьці плянуемай ВСНГ,—павышэньне вытворчасьці працы на 28 проц., зьніжэньне сабекошту продукцыі на 10 проц. Па прамысловасьці Наркомснабу рост ліку рабочых на 16 проц. вытворчасьці працы—на 35 проц, зьніжэньне сабекошту—на 11 проц.

Па Украіне (стэп), Паўночным Каўказе, Ніжняй Волзе, Сярэдняй Волзе (Заваложа) павінна быць ахоплена колгасамі ў сярэднім ня менш 80 проц. сялянскіх гаспадарак.

Для ЦЧО, Сібіру, Уралу, Украіны (лесастэп), Казакстану (збожжавыя раёны)—колектыв заваць 50 проц. сялянскіх гаспадарак.

Для спажывецкай паласы па збожжараёнах пленум намеціў колектывізацыю 25 проц і для бавоўняных і буракавых раёнаў—ня менш 50 проц. сялянскіх гаспадарак.

Па ўсім Саюзе павінна быць колектывізавана за 1931 год ня менш 50% сялянскіх гаспадарак.

Разьмер пасеўных плошчаў па ўсіх культурах павінен быць даведзен да 143 млн га, саўгасаў—да 9,5 млн га і колгасаў—ня менш 66 млн. га.

Пленум пастанавіў давесьці лік МТС да 1400 з агульнай магутнасьцю трактароў у 988 тыс. конскіх сіл.

Вялікую програму пленум намеціў па жывёлагадоўлі.

Гурт „Жывёлаводу" павінен быць даведзен да 2800 тыс., „Сьвінаводу"—да 1900 тыс., „Аўцаводу"—да 4,4 млн. галоў і малочна-масьлянага трэсту—да 11 тыс. кароў.

Пленум вызначыў аб'ём капітальных укладаньня у аграмаджаны сэктар с.-г. у 3,8 млрд. рублёў.

Вялікая програма намечана пленумам па транспарту і сувязі.

Пленум прыняў агульны разьмер грузазвароту чыгункі ў 330 млн. тон супроць 82 млн., намечаных на апошні год пяцігодкі.

Павінен быць зьніжан сабекошт перавозак у 193 годзе на 9 проц. у параўнаньні з 1930 .

Аб'ём капіталаўкладаньняў па транспарту пленумам прыняты ў памеры 3185 млн. рублёў, па сувязі—у 260 млн. рублёў, в Наркомснабу—у 230 млн. рублёў, па спажыўкооперацыі—у 365 млн. рублёў.

Вялікія зрухі пленумам намечаны па працы і культуры. Колькасьць рабочых вызначана ў 16 млн. чалавек супроць 14 млн. чал. у 1930 г.

Пленум устанавіў рост зарплаты для прамрабочых у 6 проц. і для чыгуначных рабочых у 8 проц.

Гадовы фонд соцстраху вызначан у 2138 млн. рублёў супроць 1,6 мільярда ў 1930 г.

Разьмер фубра вызначан у 285 млн рублёў, супроць 120 млн. рублёў у 1930 г.

Пленум намеціў перавод да канца 1931 году на 7-мігадзінны рабочы дзень усіх чыгуначных рабочых, ня менш 92 проц. рабочых, занятых у прамысловасьці, плянуемай ВСНГ, і 52 проц. рабочых прамысловасьці Наркомснабу, пераход на 5-дзёнку ўсіх рабочых прамысловасьці ВСНГ, за выключэньнем тэкстыльнай, і 98 проц. рабочых прамысловасьці Наркомснабу.

Гэтая програма новых перамог партыі і пролетарыяту, намечаных пленумам. У вырашэньні іх сустрэнуцца вялізарныя цяжкасьці, перамог якіх патрабуе мобілізацыі творчай ініцыятывы і энэргіі мас працоўных, палепшаньня якасьці работы ўсіх зьвеньняў дзяржаўнага, гаспадарчага і кооперацыйнага апарату.

Вынікі другога году пяцігодкі яшчэ раз пацьвердзілі правільнасьць генэральнай лініі партыі і яе ленінскага ЦК, яшчэ большай яснасьцю паказалі опортуністычную сутнасьць правых, выступаючых супроць хуткіх тэмпаў індустрыялізацыі супроць разгорнутага соцыялістычнага наступленьня па ўсім фронце.

Бышыя лідэры правых—т. т. Рыкаў і Бухарын—яшчэ раз прызналі свае памылкі. Але гэтага мала, партыя патрабуе пацьверджаньня гэтых прызнаньняў барацьбой за генэральную лінію.

Партыя дабілася посьпехаў у соцыялістычным будаўніцтве дзякуючы таму, што вяла бязьлітасную барацьбу на два фронты; супроць правай небясьпекі, як галоўнай на даным этапе, і не дапускала прымірэнскіх адносін да опортунізму ўсіх масьцей.

Ленінскі комсамол, які аказаў вялікую дапамогу партыі ў выкананьні плянаў першага і другога году пяцігодкі, у гэты рашаючы трэці год павінен яшчэ больш павысіць сваю ролю ў гаспадарча-культурным і політычным будаўніцтве.

Замацоўваючы дасягненьні, якія маюцца ў організацыі соцспаборніцтва і ўдарніцкага руху неабходна рухаць іх на вышэйшую ступень і дабівацца больш шырокага ахопу ўдарніцтвам рабочых, рабочай моладзі і пагалоўнага ахопу ім комсамольцаў.

Лёзунг „Увесь Саюз—адна ўдарная брыгада" павінен быць выканан. Неабходна рашуча змагацца за ажыцьцяўленьне лёзунгу верасьнёўскай пастановы ЦК УсеЛКСМ—„Кожны комсамолец—ударнік".

Сустрэчны прамфінплян—скразныя ўдарныя брыгады, штурмавыя брыгады, плянава-опэрацыйныя групы, грамадзкі буксір у адносінах да заводаў колгасаў і савгасаў, якія ня выконваюць вытворчых заданьняў, павінны стаць мэтодамі масавай барацьбы за пяцігодку ў чатыры гады.

„Лёгкая Кавалерыя" саюзу павінна кінуць свае сілы на будаўніцтва на барацьбу за плян з лятунамі, з непаладкамі на вытворчасьці. у савгасе і колгасе.

Асноўная ўвага комсамольскіх організацый, побач з барацьбой за павышэньне колгасных паказчыкаў, павінна быць накіравана на выкананьне якасных паказчыкаў, павышэньне вытворчасьці працы, зьніжэньне браку, прастояў, павышэньне якасьці продукцыі, умацаваньне працоўнай дысцыпліны, барацьбу з цякучасьцю рабочай сілы, за тэхніка—рацыяналізатарскія мерапрыемствы і г. д. Комсамольскія організацыі вёскі павінны яшчэ больш павысіць сваю ролю ў соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі і да іншага актыўнага ўдзелу кожнага комсамольца ў колгасным руху, у барацьбе за пашырэньне пасеўнай плошчы, за павышэньне ўраджайнасьці, за ліквідацыю кулацтва як клясы, на базе суцэльнай колектывізацыі.

Пад кіраўніцтвам партыі, Ленінскі комсамол з яшчэ большай сілай і энэргіяй павінен накіраваць сваю ініцыятыву і творчую актыўнасьць на вырашэньне задач трэцяга году пяцігодкі—рашаючага году для выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады. Даючы жорсткі адпор права-опортуністычным элемэнтам, рашуча змагаючыся з правай небясьпекай, як галоўнай на даным этапе, „левымі" загібамі і двурушніцтвам, права-„лявацкім" блёкам і прымірэнцтвам да іх, як тэорыі, так і на практыцы, партыя вядзе краіну да новых перамог.

Т. Шурыгін.

Гавораць спэцыялістыя


КОЖНАЯ ЯЧЭЙКА--ОРГАНІЗАТАР МАСАВЫХ ДОСЬЛЕДАЎ

Быць ініцыятарам організацыі працэсаў работы сьвінаводчых савгасаў і колгасаў. Унядраць досьледы навукі ў практыку соцыялістычнай гаспадаркі

Разгортваць соцспаборніцтва і ўдарніцтва, організаваць абмен соцыялістычным вопытам. Стаць на чале масавага руху вопытніцтва, рацыяналізатарства і вынаходзтва

Быць праваднікамі навуковых досьледаў

Навукова-дасьледчыя ўстановы павінны стаць сапраўднымі дапам жнікамі ў галіне рэконструкцыі сельскай гаспадаркі СССР. Толькі тыя дасягненьні і вынікі будуць каштоўны, якія зараз-жа пасьля іх вынаходжаньня будуць перанесены ў савгасы і колгасы. Комсамолу неабходна ўключыцца ў дасьледчую працу так, каб ён штодзённа прымаў удзел у пастаноўцы досьледаў па рацыяналізацыі сьвінагадоўлі ў соцыялістычным сэктары.



Асноўныя задачы комсамолу ў праваздзеньні дасягненьняў дасьледчых устаноў па сьвінагадоўлі ў савгасы і колгасы наступныя:

Скарыстаньне ўсіх дасягненьняў навукі ў галіне організацыі тэрыторыі і сядзібы гаспадаркі, дзеля чаго комсамол павінен на сваіх сходах абгаварыць пытаньні разьмеркаваньня сьвінарнікаў па сядзібе, месца для кухні, пытаньні мэханізацыі і г. д., скарыстаўшы ўсю адпаведную літаратуру, а таксама і дасягненьні паасобных савгасаў і колгасаў. Слабое месца ў галіне будоўлі сьвінагаспадарак—тэхнагляд за будаўніцтвам. Многія гаспадаркі мала скарысталі ўсе магчымасьці ў будоўлі сьвінарнікаў, каналізацыі, вэнтыляцыі, асьвятленьні і г. д. Усе дасягненьні ў галіне будоўлі павінны быць скарыстаны ў колгасах і савгасах. Комсамол савгасаў і колгасаў, як жывая і энэргічная маладая сіла, адыграе ў гэтым галоўную ролю.

У галіне кармленьня сьвіней навука мае значныя дасягненьні. Аднак, яны яшчэ не перанесены ў нутро вытворчасьці соцыялістычнага сэктару. Пастаноўка масавых досьледаў па догляду і ўтрыманьню сьвіней таксама займае вельмі пачэснае месца ў працы комсамолу.

Зараз, як ніколі, вельмі вялікае значэньне набывае вырошчваньне парасят узімку. Кожнае народжанае парася мусіць быць выгадавана і даць цэнтнэр мяса. Гадоўля парасят патрабуе шмат увагі.

Вельмі значныя дасягненьні навукі ў гэтай галіне трудна пераносяцца ў практыку. Усе сучасныя мэтады гадоўлі маладняка комсамолу належыць скарыстаць на практыцы і самому стаць далейшым дасьледчыкам у гэтай галіне.

„Шэраг" дробязяй часта губяць значную частку апаросаў. Такія „дробязі", як адсутнасьць мінэральнага харчаваньня і прагулак, растуць і атручваньне парасят у значнай меры прыводзяць іх да гібелі. Трэба павесьці вялікую барацьбу за правільнае вырашчваньне парасят.

Шэраг досьледаў па адкорму сьвіней яшчэ зусім не праведзены ў вытворчасьць. Комсамол з дапамогай дасьледчых устаноў, павінен выбраць усё лепшае і перанесьці ў сьвінарнікі савгасаў і колгасаў.

Важнейшае пытаньне зараз у сьвінаводчых гаспадарках—організацыя працы.

Пры цяперашняй пастаноўцы працы вялікая колькасьць рабочай сілы нерацыянальна затрачваецца на работу ў сьвінарніках. Акрамя правільнай організацыі працы неабходна прыняць усе меры для яе мэханізацыі, а таксама пільна сачыць за тым, каб уся праца па сьвінагадоўлі вялася пад сталым наглядам і ўносіліся ў яе новыя дасягненьні. Вось важнейшыя задачы комсамолу ў галіне выкананьня заданьняў партыі па вырошчваньню сьвіней.

С. Ж.

Організацыя працы ў сьвінаводчых гаспадарках--важнейшая задача ЛКСМБ


Хуткае вырашэньне мясной проблемы ў значнай меры залежыць ад прадукцыйнасьці працы ў сьвінаводчых гаспадарках. Але гэтай праблемай яшчэ зусім сур'ёзна не займаюцца, што трэба лічыць абсолютна ненормальным зьявішчам.

Нормы выпрацоўкі па абслугоўваньню сьвіней, „якія зьмешчаны ў тарыфна-эканамічным справачніку, не прыстасаваны да ўніверсальнага тыпу савецкіх гаспадарак і ні ў якой меры не могуць задаволіць сучасным буйным і спэцыялізаваным гаспадаркам савгасаў і колгасаў.

Уздымам вытворчасьці і правільнай організацыі працы ў буйных сьвінаводчых гаспадарках павінны заняцца ўсе грамадзкія організацыі, і ў першую чаргу комсамол. Комсамольскія організацыі савгасаў і колгасаў павінны даць прыклад сьвечасовай і добраякаснай працы, шырока растлумачваць сярод рабочых задачы па ўздыму вытворчасьці працы ў савгасах і колгасах.

Асаблівую ўвагу комсамол павінен зьвярнуць на організацыю працы ў колгасах, дзе яшчэ слабей пастаўлена работа, чым у савгасах. Комсамол павінен весьці рашучую барацьбу з рознага роду адхіленьнямі паасобных рабочых і колгасьнікаў ад працы ў сьвінарнях. Трэба на сходах заастрыць увагу рабочых і колгасьнікаў на тое, што справа сьвінагадоўлі—адна з важных задач партыі і рабочай клясы, а таму ўся працоўная грамадзкасьць павінна ўпарта змагацца за ажыцьцяўленьне.

Комсамол павінен зьвярнуць увагу рабочых савгасаў і колгасьнікаў на неабходнасьць выконваць асобны цыкл работ у сьвінаводчай гаспадарцы—павазока карму і падсьцілкі, падрыхтоўка да корму, запараваньне бульбы, падаграваньне вады (узімку абавязкова, а ўлетку па меры патрэбы) падрыхтоўка концэнтраваных мешанін (не меней, як за адзін дзень), правільны догляд і кармленьне дарослых сьвіней тры разы ў суткі (6 гадз. раніцы, 1 гадз. дня і 6 гадз. увечары), кармленьне парасят да 4-х месяцаў 4 разы ў суткі (6 гадз. раніцы, 10 гадз. дня 2 гадз. дня, 6 гадз. увечары), пойка сьвіней і парасят, чыстка сьвінарнікаў не менш разу ў суткі (выкіданьне гною мыцьцё карыт і прасушваньне, мыцьцё ка і ору), мыцьцё сьвіней і парасят у спэцыяльна зробленых ваннах (летам не менш двух разоў у месяц, узімку толькі змазка па меры патрэбы), пабелка сьвінарнікаў, выганяньне сьвіней і парасят на прагулку (абавязкова штодзённа, за выключэньнем вялікіх марозаў), пакрыцьцё матак і вядзеньне запісу злучак і апаросаў, дзяжурства пры апаросах, вядзеньне ўліку корму і падліку вагі і г. д. Усе гэтыя пытаньні работы павінны ўкладвацца ў кола дзейнасьці комсамольскай ячэйкі.



Пры ўстанаўленьні норм выпрацоўкі заўсёды трэба прымаць за адзінку станок: адна сьвінаматка, альбо 6—8 падсьвінкаў да 4-х месячнага ўзросту; 4 падсьвінкі з 4—6 месяцаў альбо 2 падсьвінкі з 6-ці месячнага ўзросту на год.

Такім чынам пры размяшчэньні сьвіней на станках і аднасобным іх кармленьні, адзін рабочы павінен абслужыць за 8 гадзін не менш 40 станкоў. Што датычыць да групавога кармленьня і ўтрыманьня сьвіней, дык у даным выпадку на аднаго рабочага павінна прыпадаць не менш 4 групавых станкоў, ці 100 адкормачных галоў сьвіней.

Гэтыя нормы толькі прыкладныя і ў конкрэтных умовах, у залежнасьці ад тыпу пабудаваных сьвінарнікаў, мэханізацыі ў працэсе вытворчасьці, могуць памяншацца, ці павялічвацца.

Пры шырокім удзеле ўсёй грамадзкасьці савгасу і колгасу, асабліва пры актыўным удзеле комсамольскай організацыі, у выпрацоўцы організацыйных і тэхнічных пытаньняў у сьвінаводчых гаспадарках, нам удасца падняць прадукцыйнасьць працы і тым самым хутчэй вырашыць задачу організацыі буйных сьвінаводчых фабрык.

А. Буткевіч

Навучыцца будаваць хутка і добра

Як дрэннае будаўніцтва, так і затрымка яго цягне за сабою вялікія страты ў сьвінагадоўлі і затрымлівае хуткае вырашэньне мясной проблемы праз сьвінагадоўлю, таму практычны ўдзел у будаўніцтве кожнай ячэйкі і кожнага комсамольца паасобку мае вялікае значэньне.

Было-б вельмі пажадана, каб кожная комсамольская ячэйка стварыла пры сабе камісію садзейнічаньня будаўніцтву з комсамольцаў—ударнікаў і лепшых рабочых.

Трэба сачыць за тым, каб быў своечасова загатоўлен і дастаўлен на месца пабудовы будаўнічы матар'ял, каб быў выкарыстан матар'ял старых непатрэбных будынкаў. Разам з гэтым, комсамольская ячэйка павінна ўзяць на сябе нагляд за насьцілкай полу, калі гэта будзе апаросны сьвінарнік, трэба сачыць, каб пад дошкі полу сапраўды было насыпана жужалю, ці пяску, каб самы пол меў ухіл на калідор пад дзьверы, і ні ў якім разе нельга дапушчаць насьцілку каменнага полу ў станках.

Трэба сачыць і за пабудовай іншых дэталяй, як, напрыклад, вэнтыляцыя, прыгонка дзьвярэй, акоўка пераборкі, лазы, кармушкі, калідор, жыжастайнік і інш.

Адна з самых цяжкіх дэталяй пры пабудове сьвінарнікаў—прыгонка акон. Трэба глядзець, каб яны на працягу ўсёй зімы не пацелі, не зацякалі і былі прыгнаны сурова па проэкту.

Пабудова сьвінарніку павінна быць скончана ў тэрмін.

Пажадана, каб колгасы, савгасы, і комсамольскія ячэйкі, якія пачынаюць будаваць сьвінарнікі, пасылалі кваліфікаваных плотнікаў, ударнікаў і комсамольцаў на экскурсію у Сьвінаводчы Інстытут (Менск Малая Сьляпянка) для азнаямленьня з тыпамі сьвінарнікаў і іх будаўніцтвам. Гэта практыка пасылкі мела вялікі посьпех, асабліва сярод колгасьнікаў.

Зубрыцкі.

СЬВІНЬНЯ АТРЫМАЕ ДОБРЫ АБЕД

Колектыў комсамолу Вэтэрынарнага Інстытуту ў Віцебску парашыў уключыцца ва ўсебеларускую сьвінаводчую эстафэту. Пытаньне аб уключэньні ў эстафэту абгаварвалася 24-га сьнежня на пасяджэньні бюро колектыву з удзелам комсамольцаў Вэтэрынарнага Інстытуту.

Колектыў парашыў прасіць гарком комсамолу вылучыць штаб па праваздзеньню эстафэты. Штаб быў вылучан з 7 чал., у штаб уваходзілі ня толькі комсамольцы Вэт. Інстытуту, але і прадстаўнікі буйных ячэек гораду. Сваё першае пасяджэньне штаб прысьвяціў наметцы конкрэтных мерапрыемстваў па практычнаму ўдзелу комсамольцаў Вэт. Інстытуту і сьвінаводчай эстафэце.

Комсамольцы інстытуту парашылі пачаваць у галіне вышукваньня корму для сьвіней. Штаб праверыць як ў некаторых сталоўках гораду выкарыстоўваюцца харчовыя адкіды. Вылучаны актыў разьбіўся на брыгады. Наладжана абсьледваньне сталовак ЦРК з мэтай выявіць рэсурсы адкідаў, якія не выкарыстоўваюцца.

У абсьледваньні прымалі ўдзел больш 40 чал. У брыгады ўключыліся і навуковыя сілы Вэт. Інстытуту. Пасьля дэталёвага абсьледваньня, брыгады выявілі лячынныя факты. У большасьці сталовак харчовыя адкіды выліваюцца ў памыйную яму, а ў некаторых сталоўках за бесцэнак прадаюцца невядомым людзям.

ЦРК мае некалькі сьвінаводчых гаспадарак. сілосаваньне ў гэтых гаспадарках праведзена дрэнна. Ячэйка комсамолу ЦРК не займалася пытаньнямі работы ў гэтых сьвінаводчых гаспадарках і, натуральна, што сотні тон каштоўнага для сьвіней корму не выкарыстоўваюцца. Сьвіньні савгасаў ЦРК будуць кінуты зімою на голад, альбо на паўгалоднае існаваньне.

Штаб сьвінаводчай эстафэты пры Вэт. інстытуце не замкнуўся ў вузкія рамкі, прыцягнуў да работы вялікую колькасьць моладзі і навуковыя сілы інстытуту. За тры пасяджэньні штаб намеціў шэраг важнейшых мерапрыемстваў па ўдзелу ў сьвінаводчай эстафэце.

Для вырашэньня кармавой проблемы штаб намеціў конкрэтныя мерапрыемствы, Адным з такіх мерапрыемстваў зьяўляецца організацыя спэцыяльных адкормачных баз. Прыблізныя падлікі паказалі, што на спажываныя адкіды, якія выкідаюцца на вуліцу, можна адкармліваць больш 800 сьвіней.

Комсамол Вэтэрынарнага інстытуту бярэ шэфства ад адкормачнымі сьвінарнікамі і, акрамя таго, вылучае паасобных таварышоў для нагляду над здароўем сьвіней.

Комсамольцы ня спыніліся на выяўленым. На адным з сваіх пасяджэньняў штаб намеціў плян выяўленьня дадаткових як захаваных, так і яўных рэсурсаў корму.


Пастановы партыі і ўраду аб вырашэньні мясной проблемы намечана папулярызаваць на сходах рабочых, а таксама правесьці шэраг дакладаў на тэму аб выкарыстаньні адкідаў, як корму для сьвіней. Комсамольцы інстытуту ў самы бліжэйшы час пачнуць узварушваць увагу комсамолу і рабочай грамадзкасьці на неабходнасьць узяць шэфства над сьвінаводчымі гаспадаркамі ЦРК і ўстанавіць рабочы кантроль за іх работай. Будзе праверана работа ЦРК і ў галіне разьвіцьця жывёлагадоўчай проблемы.

Задача комсамольцаў Вэт. інстытуту—мобілізаваць увагу ўсіх комсамольскіх ячэек з тым, каб яны прынялі ўдзел у сьвінаводчай эстафэце ў разрэзе выкананьня задач і дырэктыў партыі па вырашэньню мясной проблемы.

Пачын комсамольцаў Вэт. Інстытуту зьяўляецца надзвычайна важным і каштоўным і заслугоўвае ўвагі. Комсамольскія організацыі Беларусі, на аснове вопыту комсамольцаў Вэт. Інстытуту павінны прыняць актыўны ўдзел у сьвінаводчай эстафэце.

Праводзячы ў жыцьцё дырэктывы XVI партзьезду аб вырашэньні мясной проблемы, комсамол ажыцьцёвіць шэфства над сьвіньнёй.

С. Фэйгінзон.



НА ЗДЫМКУ: Комуна імя Сталіна, Такараўскага раёну, ЦЧО, заканчвае пабудову стадолы на 120 галоў. Работа праводзілася выключна сіламі комунараў пры дапамозе Такараўскай МТС.

Перавыбары саветаў праходзяць нездавальняюча

Комсамол Менску слаба ўдзельнічае ў перавыбарах Гарсавету

Неадкладна нагнаць упушчанае. Мобілізаваць масы комсамольцаў на актыўны ўдзел у перавыбарах

Прэзыдыум ЦВК аб ходзе перавыбараў саветаў

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР заслухаў даклад Цэнтральнай выбарчай камісіі аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія саветаў, ня гледзячы на некаторыя добрыя паказчыкі (павялічэньне яўкі выбаршчыкаў на сходы, павялічэньне партыйнага і рабочага ядра і ліку жанчын у складзе саветаў), усё-ж праходзіць нездавальняюча. Згодна даных, якія маюцца на 28-XII-30 г., па БССР праведзены перавыбары 330 саветаў Яўка выбаршчыкаў на сходы складае 65,12 проц., яўка жанчын—55,24 проц. Усяго абрана ў члены савету 12469 асоб, з якіх жанчын—21,69 проц., комуністых 10,62 проц., комсамольцаў — 6,19 проц.

Найбольш адсталымі раёнамі па яўцы выбаршчыкаў на справаздачна-перавыбарчыя сходы зьяўляюцца: Гарадоцкі, Сіроцінскі, Аршанскі, Боркавіцкі.

У найбольш адсталыя раёны побач з пасылкай брыгад для дапамогі выяжджалі цэнтральныя работнікі. У цэнтралізаваным парадку былі пасланы для дапамогі ў правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі 1396 чалавек, акрамя таго шэфскія організацыі па сваёй лініі накіравалі на месцы шэраг работнікаў.

У некаторых раёнах слаба завострана ўвага на барацьбу з права-опортуністычнай практыкай саветаў і паасобных выканкомаў. (Чарэйскі, Калыльскі і інш.)

Неадкладна мобілізаваць комсамол Менску

На буйнейшых прадпрыемствах гор. Менску —„Комунар“, „Энэргія“, „Кастрычнік“, „Бальшавік“ зусім слаба разгорнута масавая работа сярод рабочых па падрыхтоўцы да перавыбараў сельсаветаў. Фрунзэўскі і Кастрычнікаўскі РК ЛКСМБ не мобілізавалі на перавыбары сельсаветаў шырокія масы комсамольцаў. Падрыхтоўчая работа па перавыбарах гарсавету зусім не закранула навучальныя ўстановы. Комсамольскія ячэйкі навучальных устаноў у гэтай рабоце бязьдзейнічаюць.

Комсамол Менску слаба ўдзельнічае ў рабоце па праверцы выкананьня Гарсаветам наказу рабочых і ў праверцы работы паасобных депутатаў гарсавету.

Фрыд.

Рэкорд злачынных адносін

За бязьдзейнасьць, зрыў нарыхтовак, бюрократызм, шкодніцтва Стрэшынскі сельсавет, Жлобінскага раёну, быў разагнаны. У гэтым сельсавеце заселі опортуністыя, кулакі, падкулачнікі, зрывалі ўсе важнейшыя гаспадарча-політычныя кампаніі, скажалі клясавую лінію пры падатковым абкладаньні.

Аднак гэтыя факты не навучылі партыйныя і комсамольскія ячэйкі адносіцца да выбараў. Выбары сельсавету праходзяць нездавальняюча. Выбары ўжо адбыліся ў шмат якіх населеных пунктах, а вынік вельмі дрэнны. У сельсавет папалі заможнікі, падкулачнікі і п'яніцы. На прапанове парт'ячэйкі на выбарчым сходзе ў склад сельсавету высунуты Бардзілоўскі Саўка,—заможнік, які плаціць 70 рублёў падатку, пазбаўленец, учарашні старшыня царкоўнага савету.

Ня гледзячы на протэсты бедняноў, гэты „кандыдат“ абраны ў склад сельсавету.

Дзе політычная пільнасьць Стрэшынскай партыйнай і комсамольскай ячэек?

Васёлы.

„Беднату склікаць ня трэба“

У Новасёлкаўскім сельсавеце, Пухавіцкага раёну, перавыбары праходзяць нездавальняюча. Яўка на справаздачна-перавыбарчыя сходы ледзь дасягае 50 проц. У часе справаздач не выпукляюцца дасягненьні колгасаў, ня ставіцца пытаньне аб організацыі новых. Наказы не абгаварваюцца і не зацьвярджаюцца на сходах. Выбарчая камісія пра ўсё гэта ведае, але не рэагуе.

Кулацкая хлусьня „жанчыны ня ўмеюць працаваць“ не атрымлівае рашучага адпору. У выніку зусім мала жанчын абрана ў склад саветаў. Сакратар ячэйкі тав. Сіняк гаворыць, што трэба адмяніць перавыбары па некаторых пунктах, але далей гутарак гэта справа ня ідзе.

Ня лепш і ў П.-Слабодзкім сельсавеце Старшыня сельсавету Ваўчок пры справаздачы, замест таго, каб практычна паставіць пытаньне аб організацыі колгасу, адказваў на запытаньне сялян, што „росту жывёлы зараз няма з прычыны колектывізацыі і падатковага абкладаньня“.

На сходах беднаты не абгаварваліся кандыдатуры ў склад сельсавету. Зараз на прадвыбарчых сходах гэта не выпраўляецца. Упаўнаважаны РВК, тав. Булгак, заяўляе, што кандыдатуры падрыхтаваны і перад перавыбарчымі сходамі беднату склікаць ня трэба.

Бядняк.

Вучні на дапамогу перавыбарам саветаў

* Вучні пад кіраўніцтвам настаўніцтва Стара-Дароскай школы сямігодкі організавалі брыгады ў дапамогу акіркому па правядзеньню перавыбарчай кампаніі сельсавету.

Вучні па вёсках распрацоўваюць з батрачаю і беднатой пытаньні аб задачах справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў і выкананьне чарговых гаспадарчых кампаній. Брыгады таксама паставілі перад сабою мэту дамагчыся 25 проц. выбару жанчын у склад сельсавету.

Барысавец.

Пад праменьнямі юпітэраў

Патрабуем тэрмінова расьсьледваць і прыцягнуць да адказнасьці вінаватых

Больш дзесяці год працуе ў Беларусь-дзяржкіно Мотка Ханін. Змалку Ханін пачаў працаваць у кіно-тэатрах, бо надзвычайна любіў кіно і імкнуўся набыць спэцыяльнасьць у гэтай галіне.

Дзесяць год. Тольк і нядаўна, пасьля доўгіх спрачак і конфліктаў, калі пытаньне паставіла ў ЦП саюзу Працмастацтва і Працасьветы, Ханіна прынялі ў штат і залічылі памочнікам асьвятліцеля.

Прапаўнікі Б К, якія мабыць выбыліся дзе яны знаходзяцца, усякімі спосабамі імкнуліся эксплёатаваць Ханіна, ды прыстасаваць яго малапісьменнасьцю і адсталасьцю.

Перад намі вялікая кіпа дакумэнтаў: даведкі, заявы і просьбы Яны сьведчаць аб фактах ганебнай эксплёатацыі, якою займаліся і займаюцца некаторыя працаўнікі БДК. Ганебныя факты для нашай сучаснасьці.

На працягу доўгіх год Ханін працуе ў БДК, яго скарыстоўваюць на ўсялякай працы, пасылаюць прыбіраць кіно, цягаць крэслы, перацягваць скрынкі з фільмамі, купляць кіно-апаратам абеды, наймаць рамізьнікаў. За ўсё за гэта Ханіну грашы, а то і зусім не плацілі.

Бярэм характэрны дакумэнт: Выплачана тав. М. Ханіну за час з кастрычніка 27 году па...

Кастрычнік і лістапад нічога не заплацілі.

Сьнежань 1927 году...2 р. 99 к.
Студзень 1928 году, люты, сакавік, красавік, май, чэрвень, ліпень, жнівень, верасень... (нічога не плацілі).

Потым кастрычнік—2 р. 50 к. І зноў пустыя графы.

Такім чынам доўгая і цяжкая праца і ганебныя паказчыкі эксплёатацыі. Грубыя, бо злушныя адносіны ўвенчваюць гэтую агіднейшую гісторыю. Кожны камандуе, кожны лае і ўсё гэта на вачох усіх комсамольцаў, якія назіраліся пяздольнымі адараніць хлапца, дапамагчы яму стаць на сапраўдную працу.

Зараз Ханін афіцыйна залічан памесьнікам асьвятліцеля. Ён павінен асьвятляць пры зьлымках, перацягваць прылады і г. д. Але ён да гэтага часу нясе абавязкі кур'ера. Яго прымушаюць купляць білеты на чыгунку для таварыша Галкіна. Тав. Матусевіч пасылае прыбіраць кіно. Кожны ганяе з канца ў канец горада.

Нам невядома аб чым думаюць працаўнікі БДК. Ярыя праменьні юпітэраў асьвятлілі клясавае палачэньне гэты к но-„дзяльцоў“. Ярка праменьні нашай грамадзкасьці павінны заглянуць у габінэты БДК з тым, каб раз і назаўсёды накончыць з эксплёатацыяй таварыша Ханіна.

Мы чакаем слова адпаведных органаў.

Л. Гл.

У сувязі з перанясеньнем зімовага прыёму ў БДУ на вясну—прыём заяў працягнуты. Аб тэрміне іспытаў і пачатку заняткаў будзе паведамлена праз друк.

Рэктар БДУ—Караневускі.

„Чырвонай Зьмене“ прывітаньне

Першы зьлёт рабочай моладзі заводу „Домбаль“, сабраўшыся ў час уступленьня ў 3 год пяцігодкі, і напярэдадні сустрэчы IX і X зьездаў ЛКСМ, шчыра вітае Цэнтральны Орган комсамолу Беларусі—„Чырвоную Зьмену“, якая ўзброівае кожнага маладога рабочага ў яго працы і барацьбе.

Цэнтральнаму органу комсамолу Беларусі—„Чырвонай Зьмене“ зьлёт дае 216 падпішчыкаў.

Зьлёт заклікае, што лёзунг: „Кожнага маладога рабочага, які-б ня выпісваў „Чырвоную Зьмену“, выканаем у бліжэйшы тэрмін. „Комсомольская Правда“ распаўсюджана ў нас у ліку 203 экзэмпляраў. Зараз мы ўсім зьлет дае 418 падпішчыкаў на юнацкія газэты.

Няхай жыве ЦК КП(б)Б!

Няхай жыве ленінскі комсамол і баявы орган комсамолу Беларусі—„Чырвоная Зьмена“.

Першы зьлёт рабочай моладзі зав. „Домбаль“.

„Актыўна разгортвацца барацьба супроць тэрору фашысцкіх банд“

БЭРЛІН, 31. Бэрлінскі пролетарыят пачынае ўсё больш актыўна разгортваць барацьбу супроць тэрору фашысцкіх банд. У паўднёва-усходнім рабочым раёне Бэрліну рабочыя разграмілі памяшканьне адной з тамтэйшых штурмавых брыгад нацыянал-соцыялістых (фашыстых). Зусім зразумела, што ўрады ў гэтага цкаваньне фашысцкага друку супроць комуністых разгарнулася з выключнай сілай. У сувязі з гэтым „Ротэ Фанэ“ піша: „Комуністыя стала вядуць і гатовы весьці ідэолёгічную барацьбу Аднак, мы ў ніякім разе ня зьбіраемся дазволіць фашысцкім бандытам забіваць сябе з-за вугла, як гэта здарылася ўчора з адным рабочым Еркскай вуліцы... у 1930 г. фашыстыя зрабілі 32 забойствы. Рэволюцыйны пролетарыят пазбаўлен поліцэйскай абароны супроць фашыстых. Аднак, ён досыць моцны для таго, каб працістаяць фашысцкаму тэрору“.

Бярэце прыклад!

ЦК ЛКСМБ даў заданьне Петрыкаўскаму РК мобілізаваць 14 лепшых комсамольцаў на лесазагатоўкі. РК ЛКСМБ гэтае заданьне перавыканаў і накіраваў на працу ў Леспрамгас 67 лепшых комсамольцаў з сваёй організацыі.

Пост „Ч. З.“ Пінчук В. М.

Нам пішуць

* Бюро комсамольскай ячэйкі колгасу „1-ае мая“, Плешчаніцкага раёну адарвалася ад мас. Комсамольская ячэйка ў працы не адчуваецца.

Гарбуз.

* З-за дрэннага кіраўніцтва не працуе комсамольская ячэйка колгасу „Новы Шлях“ Рудзенскага сельсавету. Праца сярод беднаты і батрацтва не праводзіцца.

Сусед.

* У апошні час значна паслабіла сваю працу комсамольская ячэйка магілеўскай швэйнай фабрыкі. Некаторыя комсамольцы зьяўляюцца прагульшчыкамі, ілжэ-ўдарнікамі спазьняюцца на працу, па 15 месяцаў ня плацяць узносаў

Райкому трэба праверыць становішча працы комсамольскага колектыву швэйнай фабрыкі

Гарэлаў.

* Заслаўскі РК КСМ кіруе ячэйкамі пры дапамозе адных цыркуляраў. Жывой дапамогі ячэйкам няма.

Сумны.

* Лёзьненскі райком комсамолу павінен зацікавіцца працай комсамольскай ячэйкай Добрамысьленскага сельсавету, бо яна напярэдадні развалу.

Ударнік.

ЗА МЯЖОЮ

100000 беспрацоўных у Фінляндыі

ГЕЛЬСЫНГФОРС, 29. Экономічны крызіс ахапіў усе асноўныя галіны прамысловасьці Фінляндыі. У сувязі з гэтым хуткім тэмпам расьце беспрацоўе. К канцу лістапада лік беспрацоўных у тры разы перавысіў лік беспрацоўных, зарэгістраваных к канцу кастрычніка бягучага году, і ў сем разоў перавысіў адпаведную лічбу мінулага году. Агульная колькасьць беспрацоўных у краіне—100000 чал.

Паштовы аэраплян з італьянскім консулам запрапасьціўся

ПАРЫЖ, 29. Як паведамляе агенцтва Гавас з Агадыру (Марока) паштовы аэраплян, які вылецеў з Дакару (Сэнэгал) у Тулузу (Францыя) і перавозіў пошту з Амэрыкі і 3 пасажыраў, у тым ліку тальянскага консула Пэце (Марока), у ноч з 26 на 27 сьнежня запрапасьціўся ў раёне Віла-Сыстэро Рыо-Дэ-Оро). Пошукі да гэтага часу застаюцца без посьпеху.

Сьледуйце прыкладу

Староўская ячэйка ЛКСМБ, Слуцкага раёну, адгукнулася на пачын комсамольскага колектыву заводу „Бальшавік“ аб зборы сродкаў на пабудову самалёта імя X зьезду ЛКСМБ і сабрала ў фонд пабудовы 25 руб.

Ячэйкі сьледуйце прыкладу!

Пунчык.

У фонд абароны

* Студэнцтва Сарагалаўскага культтэхнікуму пастаноўкаю спэктаклю і падпіснымі лістамі сабралі 150 руб. у фонд пабудовы дырыжаблю імя „Праўды“. Адначасова ўсе падпісаліся на 50 проц., а ёсьць студэнты, якія падпісаліся і на ўсе 100 проц. сваёй стыпэндыі на пазыку „Пяцігодка—у чатыры гады“, што складае агульную суму па тэхнікуму 1785 рублёў, студэнты Сарагалаўск. тэхнікуму выклікаюць студэнтаў Чырвона-бярэскага броварнага тэхнікуму пасьледаваць іх прыкладу.

Студэнт—Л. ДАВІДОК.

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР—**РЭДКОЛЕГІЯ**

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599